УДК 94(368):[7.046.1+316.722]

# ВІКІНГІ Ў КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫМ ДЫСКУРСЕ

***Ю. С. Барадзін,*** *аспірант установы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле паказаны ўзаемасувязі раннесярэднявечнай скандынаўскай культуры з сучаснай масавай культурай праз культуралогію XXI ст. Аб'ектам даследавання выступае культуралагічны дыскурс на падставе ідэй французскага філосафа Мішэля Фуко. Аўтар звяртаецца да генеалогіі і дыскурсу М. Фуко, да музыкі, фільмаў і інтэрнэт-суполак, прысвечаных вікінгам. Праз розныя формы дыскурсу праводзяцца абмеркаванне і рэканструкцыя спадчыны скандынаваў.
**Ключавыя словы:** вікінгі, культуралогія, дыскурс, генеалогія, міф, масавая культура.

# VIKINGS IN CULTURAL DISCOURSE

***Y. Borodin,*** *Postgraduate Student of the Educational Institution*
*«The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article shows the relationship between the early medieval Scandinavian culture and modern mass culture through the culture of the 21st century. The object of the study is a cultural discourse based on the work of the French philosopher Michel Foucault. The author refers to the genealogy and discourse of M. Foucault, to music, films and Internet communities dedicated to the Vikings, discusses and reconstructs the Scandinavian heritage through various forms of discourse.
**Keywords:** Vikings, cultural studies, discourse, genealogy, myth, mass culture.

Культуралагічны дыскурс прадугледжвае суадносіны традыцыйнай культуры з іншымі культурамі. Французскі філосаф Мішэль Фуко з'яўляецца тэарэтыкам і аўтарам паняцця «дыскурс», які ён разглядае як мову, выказванне і частку культуры. Напрыклад, сёння пры вывучэнні культуры вікінгаў эпохі ранняга Сярэднявечча (VIII–XI стст.) яе суадносяць з масавай культурай канца XX – пачатку XXI ст. На падставе выказвання расійскага культурога Ю. Лотмана, які спрабуе суаднесці міф з сучасным, у

культуралагічным дыскурсе прапаноўваецца параўнаць культуру вікінгаў з сучаснай. Менавіта праз параўнанне культур у культуралагічным дыскурсе магчыма атрымаць апісанне культуры, якая цікавіць.

Звярнуўшыся да старажытнагрэцкай міфалогіі, М. Фуко ў дапаможніку «Дискурс и истина» стварыў «міфалагічны дыскурс», які з'яўляецца часткай культуралогіі [5, с. 34]. Праз дыскурс М. Фуко ствараецца культуралагічны дыскурс вікінгаў, праз які суразмоўцы звяртаюцца да гістарычнага мінулага скандынаваў, да філасофіі, каб зразумець іх духоўную культуру і светапогляд, часткай якога з'яўляецца язычніцкі пантэон скандынаўскіх багоў. Затым, каб адчуць прысутнасць вікінгаў у наш час, культуролагі пераходзяць да сучаснай культуры. Зыходзячы з таго, што культура і дыскурс узаемазвязаныя паміж сабой, можна прыйсці да высновы, што вікінгі ў культуры XXI ст. – частка культуралагічнага дыскурсу.

У моўным дыскурсе, калі людзі вядуць вусны дыялог, абмяркоўваецца традыцыйная, духоўная і матэрыяльная культура вікінгаў: як яны будавалі дракары (хуткасныя караблі), на якіх здзяйснялі марскія набегі, падарожжы і геаграфічныя адкрыцці новых зямель; у якіх верылі багоў, якія функцыі выконвалі багі скандынаўскага пантэону; іх прадстаўленне аб замагільным жыцці (Вальхала – палац Усебацькі Одзіна; Фольkванг – народнае поле, Хель – скандынаўскае пекла); скандынаўская эсхаталогія (Рагнарок – гібель багоў і старога свету і затым нараджэнне новага свету).

У культуралагічным даследаванні культуры вікінгаў, якое ўваходзіць у пісьмовы дыскурс, вылучаюцца іх язычніцкі светапогляд, побыт і норавы, якімі раней кіраваліся. М. Фуко праз генеалагічны праект стварае дыскурс, на падставе якога існуе генеалогія ўлады [4, с. 10] і праз якую даследуецца як генеалагічнае дрэва скандынаўскіх багоў (Одзін – вярхоўны бог скандынаваў і яго браты – Ве і Вілі, стваральнікі космасу – сыны бога Бора і волаткі Бестлы, унукі першапродка багоў Буры; Бальдр – бог вясны – і яго брат Хёд – сляпы бог зімы – сыны Одзіна і багіні дзетанараджэння Фрыг; Валі – першы бог помсты, сын Одзіна і волаткі Рынд; Відар – другі бог помсты – сын Одзіна і волаткі Рынд; Тор – грамабой – сын Одзіна і багіні зямлі Ёрд; Модзі – бог ваяўнічай лютасці, сын Тора і багіні ўрадлівасці Сіф, і Магні – сын Тора і волаткі Ярнсаксы, бог фізічнай сілы, якія пасля гібелі старога свету і багоў старэйшага пакалення ўспадкуюць молат свайго бацькі Мельёнір і разам з Бальдрам, Хёдам, Валі і Відарам атрымаюць у спадчыну ўладу над светам ад дзеда і бацькі – Одзіна і Тора, і працягнуць радавод ад аса Бора і першабога Буры), конунгаў (вышэйшых кіраўнікоў у скандынаўскім грамадстве), так і адносіны паміж народам і ўладай. У генеалогіі ўлады скандынаўскім багам уласціва паміраць, як людзям, а іх дзеці і нашчадкі на прыкладзе сыноў Одзіна і Тора атрымліваюць у спадчыну ўладу над

светам. Так жа пасля смерці правадыра вікінгаў улада пераходзіць да аднаго з ягоных сыноў і да спадкаемцаў наступных пакаленняў, такім чынам працягваючы радавод ад конунга.

Адной з формаў дыскурсу вікінгаў у Сярэднявеччы быў народны сход – тынг (скандынаўскі варыянт беларускага веча), на якім кожны меў магчымасць выступіць з словам і прапановай для вырашэння агульных пытанняў. Дыскурс – гэта не толькі інфармацыя і паведамленне праз навукова-гістарычныя даследаванні, але і слова, і выказванне, паколькі ў кожнага, хто прымаў удзел у тынгу, было права голасу, што адлюстроўвае ў дыскурсіўнай супольнасці ўзаемаадносіны паміж грамадствам і ўладай, а затым спрыяе развіццю палітычнага дыскурсу. Сама культура – прастора для любога дыскурсу, а скандынаўская міфалогія і вікінгі – неад'емная частка культуры.

М. Фуко падкрэслівае, што ў наш час навуковыя даследаванні належаць да культуралагічнага дыскурсу. Аўтары мастацкіх твораў і навукова-гістарычнай літаратуры таксама ствараюць культуралагічны дыскурс. Кнігі, напісаныя імі, спрыяюць стварэнню дыскурсіўнай супольнасці і вуснаму абмеркаванню ўдзельнікамі дыскурсу. Праз кніжную культуру чытач уваходзіць у камунікацыю з аўтарам і персанажамі твора, што таксама стварае «аўтарскі дыскурс».

У канцы XX – пачатку XXI ст. з'явіліся новыя плыні, музычныя напрамкі, паўсталі новыя формы культуралагічнага дыскурсу, напрыклад, субкультуры як нефармальная і маладзёжная частка культуры сучаснага грамадства. Раннесярэднявечная культура вікінгаў пачынае адраджацца праз рок-музыку і субкультуру металістаў, дзе нават з'явіўся новы музычны напрамак – viking metal (раней viking rock). Прадстаўнікі гэтага жанру адчуваюць сябе сучаснымі вікінгамі. Аднак, паколькі самі вікінгі жылі вельмі даўно, цяжка меркаваць, як яны выглядалі. Тым не менш вікінг-металісты імкнуцца адрадзіць спадчыну скандынаўскіх ваяроў і такім чынам праз сучасную музыку вікінгаў утвараюць культуралагічны дыскурс, паколькі музыка і тэксты – гэта таксама слова і выказванне. Як і ў кніжнай культуры, праз запіс песень і іх праслухоўванне паміж выканаўцам і слухачом ствараецца аўтарскі дыскурс. Важнае месца ў медыя-прасторы займае музычны дыскурс, які таксама з'яўляецца паведамленнем. На канцэртах музыкі вікінгаў паміж выканаўцамі і гледачамі ўзнікае песенны дыскурс, бо праз словы ў песнях і музыку перадаецца інфармацыя. Тым не менш інструментальнае выкананне без спева не з'яўляецца дыскурсам, бо дыскурс без тэкста не існуе.

Культуралагічны дыскурс вікінгаў у наш час развіваецца і праз іншыя музычныя напрамкі: сярэднявечны фолк (medieval folk) і нардычны фолк (nordic folk). Калі ў субкультуры металістаў сучасныя вікінгі выконваюць цяжкія рытмы на сучасных музычных інструментах (гітара, бас-гітара, барабаны, вакальны скрым), то ў фолк-напрамках

выканаўцы даносяць да слухачоў музыку вікінгаў, якія жылі ў раннім Сярэднявеччы, выкарыстоўваючы бубны, старажытнаскандынаўскія тэксты і руны, харавы спеў, гукі драўляных дзідаў і шчытоў, рунічныя камяні і мячы [3]. Слухачы, якія слухаюць музыку вікінгаў, альбо гледачы, якія прыходзяць на канцэрты, часткова залежныя ад дыскурсу, у які яны ўступаюць з выканаўцамі.

Яшчэ адным сучасным напрамкам у медыякультуры з'яўляецца кінафільмавы дыскурс, у якім персанажы камунікуюць не толькі паміж сабой, але таксама прыцягваюць да сябе ўвагу гледачоў.

Сёння, у эпоху развіцця камп'ютарных і інфармацыйных тэхналогій, вельмі актуальным з'яўляецца інтэрнэт-дыскурс як сродак электроннай камунікацыі. У сацыяльных сетках VK [1], Facebook [2], Instagram [7] ствараюцца інтэрнэт-суполкі для абмеркавання музычных твораў таго ці іншага viking-metal-, nordic-folk-гурта, германа-скандынаўскай міфалогіі, фільмаў ці серыялаў пра вікінгаў. Навіны і рэпосты, якія публікуюцца адміністратарамі суполак альбо чатаў у мабільных дадатках Viber і Telegram, ствараюць пачатак дыскурсіўнага абмеркавання, які атрымлівае развіццё ў каментарах, дзе людзі дзеляцца думкамі і ўражаннямі пра герояў фільмаў, серыялаў, аўтараў вікінгаўскай музыкі.

Такім чынам, М. Фуко падкрэслівае, што ў сучасную эпоху ў культуры і ў грамадскім жыцці адбываюцца шматлікія змены, калі мяняюцца формы і метады, з дапамогай якіх мяняюцца ўзаемаадносіны навукі і культуры з іншымі формамі грамадскай свядомасці. Нягледзячы на тое, што чалавек з'яўляецца адзінай у свеце істотай са здольнасцю да прамовы, культурны і навуковы аб'ект, на думку М. Фуко, – не мова, а тое, што знаходзіцца ўнутры мовы, і прадстаўляе на мове выказванне, сэнс слоў і ў выніку стварае дыскурс [6, с. 449].

*1.* Викинги. Вальхалла [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://vk.com/vikings. – Дата доступу: 20.04.2023.

2. Викинги. Вчера и сегодня [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.facebook.com/groups/vikingsliv. – Дата доступу: 20.04.2023.

3. Музыка викингов [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://vk.com/vikingsound. – Дата доступу: 20.04.2023.

*4. Фуко, М.* Археология знания / М. Фуко ; пер. с фр. С. Митина, Д. Стасова ; общ. ред. Б. Левченко. – Киев : Ника-Центр, 1996. – 208 с. – (Сер. «Opera Aparta» ; Вып. 1).

*5. Фуко, М.* Дискурс и истина / М. Фуко ; пер. с англ. А. М. Корбута ; Белорус. гос. ун-т, Центр проблем развития образования. – Минск : Пропилеи, 2006. – 152 с.

*6. Фуко, М.* Слова и вещи / М. Фуко ; пер. с фр. Н. С. Автономовой, В. П. Визгиной. – М. : Прогресс, 1977. – 488 с.

*7.* Vikings History [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.instagram.com/historyvikings. – Дата доступу: 20.04.2023.